ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела культуры Смаргонскага райвыканкама
Т.М.Ражэва

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення раённага агляда-конкурса сямейна-абрадавай творчасці сярод устаноў культуры клубнага тыпу Смаргонскага раёна

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення раённага агляда-конкурса сямейна-абрадавай творчасці сярод устаноў культуры клубнага тыпу Смаргонскага раёна (далей – конкурс).
2. Арганізатарамі конкурса з’яўляюцца: аддзел культуры Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта, дзяржаўная ўстанова культуры “Смаргонскі раённы цэнтр культуры”.
3. Конкурс праводзіцца раз у два гады з мэтай захавання і папулярызацыі абрадавай дзейнасці Смаргонскага рэгіёна. Падчас правядзення конкурса вырашаюцца наступныя задачы: актывізацыя фальклорна-этнаграфічнай дзейнасці клубных устаноў па захаванні і папулярызацыі ўнікальнай фальклорнай спадчыны; далучэнне дзяцей, моладзі да традыцыйнай культуры шляхам іх уцягнення ў даследчую і творчую дзейнасць у рамках конкурса; выхаванне дзяцей і моладзі на падставе традыцый народнай культуры; далейшае развіццё самабытных мясцовых культурных традыцый.
4. Конкурс будзе праводзіцца на працягу 2026 г.
5. У аглядзе-конкурсе прымаюць удзел структурныя падраздзяленні ДУК “Смаргонскі раёны цэнтр культуры” (далей – структурныя падраздзяленні).
6. На агляд-конкурс прэзентуецца абрад (фрагмент абраду) мясцовасці, на якой дзейнічае ўстанова культуры, працягласцю да 20 хвілін.
7. Пераможцаў конкурса вылучае кампетэнтнае журы (Дададак 1).
8. Пры падвядзенні вынікаў конкурса ўлічваюцца: дакладнасць перадачы аўтэнтычнасці прэзентаванага фальклорнага матэрыялу; цэласнасць сцэнічнай пастаноўкі конкурснай праграмы; выкарыстанне атрыбутыкі.
9. Пераможцы конкурса ўзнагароджаюцца дыпломамі 1, 2, 3 ступені і падарункамі. Астатнія ўдзельнікі атрымліваюць дыпломы “За ўдзел”.

11. Для ўдзелу ў конкурсе структурным падраздзяленням неабходна да 1 сакавіка паведаміць спецыялістаў метадычнага аддзела ДУК “Смаргонскі раённы цэнтр культуры” пра назву абраду і дату яго правядзення для састаўлення графіка.

12. Фінансаванне конкурса і транспартныя выдаткі ажыццяўляецца за кошт пазабюджэтных сродкаў ДУК “Смаргонскі раёны цэнтр культуры”.

13. Для фінансавання конкурса могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

14. Падчас конкурса вядзецца фота- і відэаздымка. Арганізатары пакідаюць за сабой права выкарыстоўваць дадзены матэрыял у рэкламных мэтах без узгаднення з удзельнікамі.

15. Па ўсіх пытаннях, звязаных з удзелам у конкурсе, а таксама па пытаннях агульнай праграмы мерапрыемства, звяртацца па тэлефону: (01592)37314.

Дадатак №1

да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзеняя раённага агляда-конкурса сямейна-абрадавай творчасці сярод устаноў культуры клубнага тыпу Смаргонскага раёна

# СКЛАД ЖУРЫ

агляда-конкурса сямейна-абрадавай творчасці сярод устаноў культуры клубнага тыпу Смаргонскага раёна

| | | |
|---|---|---|
| 1. Ражэва Т.М. | – | начальнік аддзела культуры Смаргонскага райвыканкама, *старшыня журы;* |
| 2. Крацянок Г.І. | – | дырэктар дзяржаўнай установы культуры "Смаргонскі раённы цэнтр культуры", *намеснік старшыні;* |
| 3. Чудакоўская Н.С | – | галоўны спецыяліст аддзела культуры Смаргонскага райвыканкама; |
| 4. Барахоўская Л.П. | – | загадчык метадычнага аддзела дзяржаўнай установы культуры "Смаргонскі раённы цэнтр культуры"; |
| 5. Жабінская С. С. | – | метадыст метадычнага аддзела дзяржаўнай установы культуры "Смаргонскі раённы цэнтр культуры". |